**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь**
**народны хор «Сож»**
**філіяла «Навагуцкі дом культуры»**
**ДУ «Цэнтр культуры Гомельскага раёна»**

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны хор «Сож» быў створаны ў жніўні 1982 года пры саўгасе-камбінаце «Сож», Гомельскага раёна, Гомельскай вобласці.

Нязменным кіраўніком калектыву з'яўляецца Кірыкаў Яўген Аляксандравіч. Дзякуючы ініцыятыўнасці і прафесійнасці кіраўніка калектыў набыў самабытны каларыт, які вылучае яго сярод іншых харавых калектываў Гомельскай вобласці.

У 1985 годзе хору «Сож» было прысвоена найменне «народны аматарскі калектыў», а ў 2009 годзе за творчыя дасягненні, высокае выканальніцкае майстэрства, актыўную канцэртную дзейнасць, уклад у развіццё і папулярызацыю нацыянальнага мастацтва, ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

У складзе хору дваццаць адзін удзельнік. Гэта калектыў аднадумцаў і энтузіястаў, сапраўды закаханых у беларускую песню, якіх аб'ядноўвае жаданне спазнаць спецыфіку харавога мастацтва. Яны не шкадуюць ні сіл, ні часу на любімую справу, што спрыяе павышэнню якасці выканання твораў. Праца хоры накіравана на адраджэнне, захаванне і прапаганду народнага песеннага мастацтва.

У рэпертуар калектыву ўваходзяць лепшыя ўзоры песеннай творчасці. Аснову рапертуару складаюць апрацоўкі беларускіх народных песень, творы беларускіх кампазітараў, уласныя аўтарскія песні. Некаторыя з іх апрацаваны кіраўніком, напрыклад: «Каля саду хадзіла», «Хлеб-соль», «Санта Марыя Чарнобыля» і іншыя.

Яркі і самабытны Заслужаны аматарскі калектыў народны хор «Сож» захоўвае беларускую нацыянальную культуру, дорыць гледачам магчымасць дакрануцца да песеннага багацця сінявокай Беларусі.

